Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-01-11

# Пункцірам

✔Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка падпісаў распараджэнне, якім зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта Беларусі па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў. Заахвочана больш як 1600 навучэнцаў, студэнтаў і педагагічных работнікаў, а таксама два навукова-даследчыя і творчыя аб'яднанні навучэнцаў.

✔У Брэсце стартаваў XXV Міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары». З адкрыццём форуму ўдзельнікаў і гасцей павіншаваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

✔За выдатныя навуковыя вынікі, атрыманыя падчас сумесных даследаванняў, Акадэміі навук Беларусі і Расіі ўручылі прэміі 2012 года. У сферы гуманітарных навук узнагароды атрымалі і прадстаўнікі Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі Аляксандр Цітавец, Сяргей Мілючэнкаў і Галіна Каспяровіч.

✔Савет міністраў Беларусі зацвердзіў спіс матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія вызвалены ад падатку на нерухомасць (80 аб'ектаў), зямельнага падатку і арэнднай платы за зямельныя ўчасткі (каля 180 аб'ектаў).

✔Дзень Беларусі прайшоў на буйным культурным і дабрачынным калядным кірмашы ў Санкт-Пецярбургу. У ліку найбольш папулярных сярод прадстаўленай прадукцыі — смалявіцкія валёнкі.

✔Эмблему культурнай сталіцы Беларусі і дзяржаў СНД 2013 года — Магілёва — упрыгожыла выява гарадской ратушы. Малюнак распрацаваны Кацярынай Табанюхінай.

✔Беларускі ансамбль «Смаляначка» Смалявіцкага гарадскога Дома культуры ў дні святкавання Старога Новага года прадставіць нацыянальную культуру ў Сардзініі (Італія).

✔Каля сотні экспанатаў, сярод якіх поўны збор гісторыка-дакументальных хронік «Памяць», будзе прадстаўлена на выстаўцы «Край лясоў і азёр», прымеркаванай да 75-годдзя ўтварэння Віцебскай вобласці. Выстаўка адкрыецца ў музеі беларускага кнігадрукавання — філіяле Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

✔Фестывальны каляндар Мінскай вобласці 2013 года ўключае больш як 20 культурных мерапрыемстваў. Упершыню адбудзецца абласное свята народнай творчасці «Слуцкія паясы».

✔У Беларусі плануецца адрадзіць прафесійную школу драўлянага дойлідства, паведаміў намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва Дзмітрый Семянкевіч.

✔Перспектывы развіцця лічбавага тэлебачання ў Беларусі былі абмеркаваны ўчора падчас прэс-канферэнцыі, што прайшла ў Нацыянальным прэс-цэнтры Беларусі.

✔На гродзенскіх вуліцах з'явіліся білборды з сацыяльнай рэкламай у падтрымку беларускай мовы.

**Падрыхтавала**
**Таццяна МАСТОЎСКАЯ**

Таццяна Мастоўская. Пункцірам